**Ільын, В.** Малітоўныя дамы / В. Ільын // Герой працы (Шуміліна). – 2006. – 8 снеж. – С. 5.

## МАЛІТОЎНЫЯ ДАМЫ

Багатая зямля шумілінская сваімі традыцыямі, культурай, верай. Давялося папрацаваць з архіўнымі дакументамі, хачу прапанаваць чытачам раённай газеты спіс культавых устаноў, якія дзейнічалі на тэрыторыі нашага раёна пасля рэвалюцыі 1917 года, калі яшчэ не было масавага закрыцця і руйнавання малітоўных дамоў. Магчыма, той-сёй знойдзе прозвішча сваіх дзядоў і прадзедаў.

У 1923 годзе была праведзена паўсюдная перарэгістрацыя рэлігійных абшчын. На нашай тэрыторыі было больш праваслаўных цэркваў (такіх прыходаў зарэгістравана 17).

**Ужляцінская царква**, размешчаная ў вёсцы Ужляціна Кузняцоўскай воласці. Святар і сакратар прыходскага савета – Шароў Міхаіл Васільевіч, старшыня прыходскага савета – Арэшанкаў Мікалай Аляксеевіч, таварыш старшыні – Кірылаў Іван Фядосавіч.

**Дабейская царква**, размешчаная ў вёсцы Дабея Каменеўскай воласці. Святар і старшыня царкоўнага савета – Мацкевіч Мікалай Львовіч, памочнік і сакратар – Валадуцкі Іаан Іаанавіч.

**Лавожская Свята-Успенская царква,** размешчаная ў вёсцы Лоўша Лавожскай воласці. Святар і старшыня прыходскага савета – Румянцаў Аляксандар Іванавіч, дзяк – Шакала Аляксей Мікалаевіч.

**Навікоўская Свята-Пакроўская царва,** размешчаная ў вёсцы Навікі Каменеўскай воласці. Настаяцель царквы і старшыня царкоўна-прыходскага савета – пратаерэй Акаловіч Мікалай Фаміч, таварыш старшыні – Гаранец Кірыян Іванавіч.

**Лескавіцкая Свята-Сергіеўская царква,** размешчаная ў вёсцы Лескавічы Кузняцоўскай воласці. Святар і старшыня прыходскага савета – Гурынаў Рыгор Касьміч. Дзяк, псаломшчык і сакратар – Іваноў Еўдакім Рыгоравіч, таварыш старшыні – Бераснеў Пракоп Фёдаравіч.

**Жарабыцкая царква** ў вёсцы Слабада-Жарабычы Кузняцоўскай воласці. Святар і старшыня прыходскага савета – Чыстоўскі Іван Дзмітрыевіч, дзяк і сакратар – Шыркевіч Аляксандр Іванавіч.

**Полцеўская Пятра-Паўлаўская царва** ў вёсцы Полцева Кузняцоўскай воласці. Настаяцель – іерэй Чыстоўскі Дзмітрый Іванавіч, дзяк і старшыня прыходскага савета – Л. Сапега.

**Станіслававоўская царква**, размешчаная ў вёсцы Станіславова Лавожскай воласці. Святар – Барысевіч Васіль Іванавіч.

**Міткавіцкая Свята-Успенская царква** ў вёсцы Крывое Сяло Каменеўскай воласці. Святар – Сямёнаў Васіль Іванавіч.

**Сіроцінская царква** ў мястэчку Сіроціна Лавожскай воласці. Святар і старшыня прыходскага савета – Смірноў Георгій Георгіевіч, царкоўны стараста – Лазука Іван Іванавіч.

**Мішневіцкая Свята-Ільінская царква** ў вёсцы Мішневічы Лавожскай воласці. Старшыня прыходскага савета – Карнееў Васіль, таварыш старшыні – Паўхлеб Міхаіл, сакратар і святар – Радзімінскі Іван.

**Улазавіцкая царква**, размешчаная ў вёсцы Пятніцкае. Святар – Ласкі Іаан Львовіч.

**Барсучынская царква** ў вёсцы Барсучына Лавожскай воласці. Святар – Цітоў Іван Апанасавіч, псаломшчык – Базыленка Васіль Сямёнавіч.

**Шумілінская Свята-Мікалаеўская царква**, размешчаная ў вёсцы Шуміліна Лавожскай воласці. Святар і старшыня прыходскага савета – Азевіч Іван Іванавіч, сакратар – Паўлоўскі Мікалай Міхайлавіч.

**Обаль-Ануфрыеўская царква**, размешчаная ў вёсцы Ігумена-Обаль Петрапаўлаўскай воласці.

**Чэрніцкая царква**, размешчаная ў вёсцы Чэрніца Петрапаўлаўскай воласці.

**Ігумена-Обальская царква** ў вёсцы Ігумена-Обаль Петрапаўлаўскай воласці.

Было зарэгістравана сем Стараверскіх рэлігійных абшчын.

**Добрынская Успенская царква**, размешчаная ў вёсцы Добрына Лавожскай воласці. Старшыня прыходскага савета – Лапавухаў Кіра Агеевіч, таварыш старшыні – Марозаў Малах Аляксандравіч, казначэй – Красікаў Мацвей.

**Жалудоўская царква**, размешчаная ў вёсцы Жалудова Каменеўскай воласці. Духоўнік – Краўцоў Ігнацій Сяргеевіч, псаломшчык – Юрчанка Пахомій Іванавіч.

**Заборская царква** ў вёсцы Забор'е Каменеўскай воласці. Духоўнік – Якушэў Аўраам.

**Латкоўская царква** паморскай згоды, размешчаная ў вёсцы Латкоў Лавожскай воласці. Старшыня прыходскага савета – Лапавухаў Ерамей Федасеевіч, таварыш старшыні – Новікаў Патап, сакратар – Лапавухаў Іван Савельевіч.

**Сідараўшчынская царква** ў вёсцы Сідараўшчына Лавожскай воласці.

**Шманоўская царква** ў вёсцы Шмано Лавожскай воласці. Настаяцель – Скамарошчанка Апанас Фёдаравіч, старшыня прыходскага савета – Глушнёў Клім Мацвеевіч, таварыш старшыні – Шалаеў Гаўрыл Васільевіч.

**Плюшчаўская царква**, размешчаная ў вёсцы Плюшчаўка Кузняцоўскай воласці (цяпер вёска Непароты). Святар – Крылоў Трафім Фокіч, старшыня прыходскага савета – Фядкоў Кузьма Кіравіч, стараста – Глякаў Рыгор Фядотавіч, сакратар – Фядкоў Іван Кліменцьевіч.

Трэба адзначыць, што ў даваенны перыяд XX стагоддзя на Шуміліншчыне пражывала нямала яўрэяў, у 1923 годзе былі **зарэгістраваны 4 іудзейскія рэлігійныя абшчыны.**

**Шумілінская сінагога**, размешчаная ў мястэчку Шуміліна Ловажскай воласці. Старшыня абшчыны – Рабіновіч Давід, таварыш старшыні – Лур'е Нахем, сакратар – Грышканскі Шац.

**Сіроцінская сінагога** «Хабатка», размешчаная ў мястэчку Сіроціна Лавожскай воласці.

**Любавіцкая сінагога**, размешчаная ў мястэчку Сіроціна Лавожскай воласці.

**Пясчанская сінагога** «Пясчанка», размешчаная ў мястэчку Сіроціна Лавожскай воласці. Старшыня – Гірша Іоф.

Самым малалікім веравызначэннем у тыя часы было каталіцкае. Быў зарэгістраваны адзін касцёл, размешчаны ў вёсцы Непароты Кузняцоўскай воласці.

**В. Ільын, грамадскі карэспандэнт.**